# Мастачка родам з Мазыра

***Ёсць падзеі, якія закранаюць вялікую колькасць людзей і пакідаюць глыбокі след у іх жыццях. Так адбылося, калі раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай быў аб'яўлены конкурс на лепшую пошукавую працу сярод бібліятэк Мазырскага раёна. Па адной толькі назве – «Ён наш зямляк, ён наша слава» – было зразумела, што пакладзены пачатак важнай і цікавай падзеі.***

Заняцца вывучэннем творчасці мастачкі Ірыны Оркінай пашчасціла бібліятэкарам гарадской дзіцячай бібліятэкі мікрараёна «Маладзёжны». Вынікам даследавання стала сустрэча з мастачкай, што адбылася 18 сакавіка ў галерэі «Зачараваныя родным краем» цэнтральнай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна.

І. Оркіна – унікальны чалавек. Мастак і скульптар (працуе ў стылі свабодных асацыяцыяў), майстар жывапісу і графікі, празаік і паэт, прычым у паэзіі яна стварыла ўласны стыль – вершаграфіку. Кожная яе керамічная кампазіцыя – гэта сапраўдная паэма ў гліне, гэта жыццё ў гліне. Яе працы – не проста кераміка, гэта скульптура, зразумелая хутчэй унутранаму погляду, чым вачам. Тое ж датычыцца і яе графічных працаў.

І. Оркіна – сябра Саюза мастакоў Расіі, Міжнароднай асацыяцыі выяўленчых мастацтваў пры ЮНЕСКА, аўтар і ўдзельнік больш як 250 персанальных і групавых мастацкіх праектаў у Расіі, Японіі, Кітаі, ЗША, Францыі, Германіі і іншых краінах. Вядомая І. Оркіна і як таленавіты педагог: ужо 22 гады яна вучыць дзяцей мастацтву керамікі, праводзіць майстар-класы. І на ўсё ў яе хапае часу, натхнення і душы.

Нарадзілася Ірына Арсеньеўна ў Мазыры. І хаця жыла ў іншых мясцінах, усё роўна прыязджае ў Беларусь. Ёй усё цікава, усё быццам расцвітае пад яе позіркам, выплаўляецца ў творчасць – становіцца паэзіяй, керамікай, графікай, жывапісам і нават філасофіяй. Ні яна сама, ні яе працы ніколі не пакідаюць абыякавымі. Так было і гэтым разам.

Пад час сустрэчы мастачка ўзгадала сваіх родных, успомніла дзяцінства. Госці пачулі цікавыя гісторыі, звязаныя з яе жыццём і творчасцю. Ірына Арсеньеўна прачытала вершы з кнігі «Вершаграфіка» (2008), пазнаёміла прысутных са сваёй новай кнігай «Скульптура свободных ассоциаций». Таксама госці сустрэчы даведаліся аб новым праекце мастачкі «Асацыяцыі».

І сама І. Оркіна, і яе творчасць – неардынарныя і непаўторныя. Праз свае працы мастачка дорыць любоў, радасць і энергію сваёй душы ўсім, хто гатовы іх успрыняць. Яна здзіўляе ідэямі, натхняе, дапамагае ўбачыць жыццё ва ўсім яго харастве, вучыць бачыць прыгажосць у простых рэчах, вучыць не толькі глядзець, але і бачыць, не толькі слухаць, але і чуць, адчуваць і быць уважлівымі – да таго, што нас акружае, і да тых, хто нас акружае, дапамагае нанава адкрыць для сябе свет. А яшчэ Ірына Арсеньеўна носіць у сабе асаблівы ўнутраны настрой, які станоўча дзейнічае на іншых.

Не завяршэнне сустрэчы Ірына Арсеньеўна падарыла бібліятэцы свае кнігі «Вершаграфіка» і «Скульптура свободных ассоциаций».

*Марыя БАНДАРЭНКА,*
*бібліятэкар гарадской*
*дзіцячай бібліятэкі мікрараёна*
*«Маладзёжны» г. Мазыра*



*Ірына Оркіна (у цэнтры) з загадчыцай дзіцячай бібліятэкі Надзеяй Шумскай і бібліятэкарам Марыяй Бандарэнка*

Бандарэнка, М. Мастачка родам з Мазыра / Марыя Бандарэнка / Краязнаўчая газета. – 2017. – красавік (№13). – С. 7.